№ 88. 15 сьнежня 1916 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.).

ГОМАН

БЕЛАРУСКАЯ ВІЛЕНСКАЯ ЧАСОПІСЬ

ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ У ТЫДЗЕНЬ: У АЎТОРКІ І ПЯТНІЦЫ.

Цэна с перэсылкай і дастаукай да хаты: на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы—1 м. 20 ф., на 1 мес.—40 фэн.

Адрэс рэдакціі: Вільня, Завальная 7.
Адрэс адміністрацыі і экспэдыцыі: М. Стэфанская 23.

Цэна абвестак: на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі — 25 фэніг.; дробные абвесткі—па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці — 60 фэн. за лінейку дробн. друкам.

Вайна да канца!

Упадак глаунакамандуючаго Жоффра.

14 сьнежня..

Заходні театр:

Фронт Рупрэхта Баварскаго: На паадзінокіх адрэзках фронту на Сомме—ад часу да часу бітвы артылерыі.

Фронт нямецкаго Насьледніка: Француские патрулі, каторые пры Фур дэ Пары, у Аргоннах, пасьля вострай падгатоўкі агнём прабавалі наступаць, адбіты. На правым беразі Маасу паабедзі агонь артылерыі крапчэў.

Усходні тэатр:

Фронт Леопольда Баварскаго: Нічога выдатнаго.

Фронт эрц-герцога Іозэфа: У лясістых Карпатах — агонь артылерыі. У гарах Джыэрджыу і ў даліне Тротусуля расейцы вялі далей свае дарэмные штурмы, марнуючы людзей.

Фронт фэльдмаршалка Макензэна: Ня гледзячы на ўнадта вялікіе прашкоды с прычыны благіх дарог,—на ўсім фронці добрые ўдачы. Вялікая Валахія на палудні ад лініі Букарэшт — Чэрнавода ачышчэна ад ворагоў.

Македонскі фронт: Штурмы сэрбоў на ўсходзі ад Чэрнай разбіліся перад боўгарскімі пазыцыямі с цяжкімі стратамі.

Упадак глаунакамандуючаго Жоффра.

ПАРЫЖ. Дэкрэтам прэзыдэнта рэспублікі генэрал Жоффр назначэн урадовым райчым дзеля спраў вядзеньня вайны.

Гіндэнбург аб будучыне.

БЭРЛІН. Карэспандэнту нь'юіоркскай газэты, Віганду, Гіндэнбург сказаў:

„Чаго саюзьнікі не дайшлі ў 1915 гаду, чаго не здалелі зрабіць за 1916 год—разграміць Нямеччыну, гэта, на іх думку, павінно стацца ў 1917 гаду. Ніхай толькі яны прыйдуць! Мы ўбачым—і яны ўбачуць... Мы выгралі вайну, бо зрабілі немагчымым для ворагоў дайсьці іхнай мэты. Гэтаго мы дайшлі дагэтуль і дойдзем да канца".

Вайна да канца!

ЛОНДОН Як даносяць розные газэты, Ллойд Джорж паслаў Брыану тэлеграму, выказываючы сваю нязломную волю давясьці вайну да пабеднаго канца.

Брыан тэлеграмай прылучыўся да думкі Ллойда Джорджа.

ЛУГАНО. Атказу англіцкіх газэт адмовай на мірнае прэдлажэньне Нямеччыны адпаведаюць заявы італьянскай прэссы, што справа ідзе аб ашуканскую спробу немцоў.

ПАРУЖ. „Petit Journal" пішэ: „Выступленьне Нямеччыны падобно да яе папярэдніх выступленьнёў. Яно больш выразнае, але гэта ўсё ешчэ крок, каторы мае мэту занепакоіць грамадзкую думку ў саюзьніцкіх дзержавах і пасварыць саюзьнікоў між сабой. Ня гледзячы на ўсе пабедные песьні, ў Нямеччыне многа страху, каторы і тлумачыць апошні крок яе кіраўнікоў".

ЛОНДОН. Тутэйшы карэспандэнт „Manchester Guardian" пішэ, што Нямеччына пачынае перакнывацца, што яна дайшла апошніх граніц сваей ваеннай моцы, і што ў найчасьлівейшым здарэньні вайна скончыцца змаганьнем да поўнай адмогі.

Прэдлажэньне міра.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). 12.XII. Імператар выдаў гэткі прыказ для арміі:

„Салдаты! Маючы сьведомасць пабеды, якой мы дайшлі дзякуючы вашай адвазе, я і валадары саюзных з намі дзержаў прэдлажылі ворагам мір. Невядома, чы удасцца дайсьці намечэнай мэты. Вы-ж далей, с помачу Бога, павінны ўстаць супроць ворагоў і званаваць іх".

Запаведзь міра.

Зусім неўспадзеўкі прыйшла вестка, што Нямецкі Імператар разам са сваімі саюзьнікамі прэдлажылі сваім дзесяці ворагам цераз нэутральные дзержавы зрабіць згоду. Калі—вечэрам 12 сьнежня — вестка гэта была ў Вільні апавешчэна незвычайнымі выданьнямі газэт, народ аднёсся да гэтаго вельмі асьцярожна. Людзі чыталі тэлеграму, шмат аб ей гутарылі, але нідзе не было відаць праяў радасьці. Прычына гэтаго — тое, што людзі як-бытцым інстынктам прачувалі, што у правіцельств саюзьнікоў прэдлажэньне міра не знойдзе жывейшаго адгалоску. Гэта вядома кожнаму, хто чытае сыстэматычна газэты і знае палітычнае палажэньне ў ваюючых дзержавах. Назначэньне Трэпова і яго ваяўнічая прамова ў Думе, новае міністэрство ў Англіі пад маршалкоўствам б. міністра амуніціі Ллойда Джорджа—ўсё гэта веяк не вяжэцца з думкай аб магчымасьці уладзіць мірную конфэрэнцію.

Нельга цешыць сябе ільлюзіей, бытцым ужо заўтра, або цераз месяц, ці цераз чверць году прэдлажэньне Нямецкаго Імператара дойдзе сваей мэты. Калі 31 ліпня 1914 году пачалася сусьветная вайна і кожын дзень прыносіў усё новые і новые весткі аб ваенных выступленьнях паадзінокіх гасударств, дык вельмі часта можна было пачуць гутарку: пачаць вайну—лёгка, але закончыць яе будзе шмат цяжэй. І вось у гэтым цяжкім палажэньні знаходзяцца цяпер народы Эуропы. Англія і Расея разам с Францыей, бадай, не прыстануць на мірную конфэрэнцію, бо пры цяперашнім палажэньні на іх фронтах мір азначае пабеду цэнтральных гасударств Саюзьнікі, асабліва-ж Англія, ўсё ешчэ спадзяюцца, што ім удасцца павялічыць свае сілы і дайсьці перавагі на вайне. С прычыны сваей эгоістычнай палітыкі Англія, раўнуючы да другіх дзержаў, мела дагэтуль вельмі мала страт; яна спадзяецца, што, калі на адну чашку вагі будуць кінуты ўсе аружные сілы англіцкаго народу, дык чашка саюзьнікоў перавежыць. Ня будзем разбіраць пытаньня, ці такі пагляд — справедлівы.

Але, калі мірнае прэдлажэньне Імператара Вільгэльма і будзе адкінуто, дык нельга яго і лішне нізка цаніць. Гэта-ж за 29 месяцоў сусьветнай вайны—першы голас за мір, які мы пачулі з вышыні трону. І гэты голас—не голас пабітаго, не молючаго аб міласьці, а голас пабедзіцеля, здабыўшаго Бэльгію, Сэрбію, Румынію, войскі каторага занімаюць дзесятую часьць Францыі, ўсю Польшчу, ўсю Літву, Курляндію, значную часьць Беларусі.

Вайна ешчэ будзе трываць далей і, трэба спадзевацца, ў найбліжэйшым часі дойдзе найвялікшай сілы. Ня гледзячы на гэта, голас Нямеччыны за мір паказвае нам, што кожын дзень цераз горы трупоў і рэкі крыві ўсё болей і болей набліжае нам мір. І затым-то дзень 12 сьнежня у гісторыі сусьветнай вайны будзе лічыцца памятным.

Адгалоскі прэссы.

БЭРЛІН. «Voss. Ztg.» пішэ: „Нямеччына магла выцягнуць руку да міра толькі маючы сьведомасць сваей сілы. Мы хочэмо скончыць вайну чым скарэй. Калі нашы ворагі ня зробяць згоды сваей ахвотай, дык мы даб'емся міра мячом".

„Deutsche Tages Ztg." пішэ: „Ніхто ня можэ не бачыць, што на дарозі гэтаго мірнаго прэдлажэньня ёсць скалы і небасьпечнасьці".

«Vorwärts» кажэ: „Работнікі Англіі, Францыі, Італіі і Расеі маюць перад сабой задачу: аказаць сьвету нязмерную услугу, прыступаючы разам з немцамі да працы дзеля згоды".

ЛОНДОН. «Star» дамагаецца, каб цэнтральные дзержавы аддалі Расеі Константынополь і Дар

данэллы, а Францыі—Эльзас і Лётарынгію, пакінулі-бы занятые землі і заплацілі-бы за зробленые шкоды і ваенные выдаткі. Тады нямецкіе прэдлажэньня могуць адбіцца на ходзі вайны.

«Times» кажэ, што мірнае прэдлажэньне—няшчырае. Нямеччына дарма працавала, каб Амэрыка ўзялася за пасрэдніцтво. Калі гэта не ўдалося, Нямеччына сама выступіла з мірным прэдлажэньнем. Гэта паказвае, што Нямеччына пачувае сябе слабай.

Лібэральная «Daily Chronicl» пішэ: „Нямеччына можэ мець мір кожын дзень, калі яна згодзіцца на нашы дамаганьня. Калі Нямеччына хочэ іх ведаць, мы можэм яе аб гэтым паведаміць. Мы ўвесь час адзначывалі, што глаўны варунак—гэта выдача нямецкаго ваеннаго флоту і поўнае разброеньне цэнтральных дзержаў“.

ЛОНДОН. (Рэўтэр). Міністэр Гэндэрсон у Кляфане сказаў прамову, гаворучы, што для Англіі ешчэ не прыйшоў канец вайны. Англія ня хочэ міра, пакуль Бэльгія, Францыя і Румынія будуць знахадзіцца ў цяперашнім палажэньні.

У Вільні і ваколіцах.

× **Унівэрсытэцкіе лекціі беларускай мовы.** Як нас паведамляюць з Вроцлавя, чысло студэнтоў на лекціях беларускай мовы вядомаго слявіста праф. Абіхта узрастае. 40% чысла цяперашніх слухачоў становяць ваенные.

× **Цікавае прэдлажэньне.** Вроцлаўскае выдавецтво „Pribatsch“ звярнулося да прафэсара Абіхта с прэдлажэньнем, што яно гатово ўзяцца за выдаваньне беларускіх навуковых і бэлетрыстычных кніг.

Мы цьвёрда пераконаны аб сьветлай будучыне нашай справы, але трэба прызнацца, што оптымізм вроцлаўскай выдавецкай фірмы прэвысіў усе нашы спадзеваньня. Як трэба глядзець на нашу справу, каб цяпер—у часі вайны, калі далейшая доля нашаго народу невядома,—быць гатовым занімацца выдаваньнем беларускіх твороў?!

× **Паляк аб беларускай мове.** Гэтымі днямі ў „Dzienn. Polskim“ была надрукована цікавая стацьця аб прэссе розных націй нашаго краю. Невядомы нам аўтор, гаворачы аб беларусах, відаць, думае, што беларусы—зусім незнаны для яго чытачоў народ, і з гэтай прычыны тлумачыць, што „беларусы гавораць беларускай мовай, каторая да расейскай мовы адносіцца гэтак сама, як скандынаўскіе мовы—да нямецкай“. Мы падаем гэтые словы затым, што імі невядомы нам польскі аўтор даводзіць незалежнасьці і самабытнасьці беларускай мовы: ня мог жэ аўтор лічыць, што шведзкая або норвэжская мова—гэта „гуттаркі“—дыалекты нямецкай мовы!

× **Беларускі вечар на карысць беларускіх школ.** Вечар гэты—то быў першы публічны зварот да грамадзянства аб помач беларускім школам. Наагул, вечар прайшоў удачна Хаця прэдстаўнікоў „вярхоў“ можна было палічыць на пальцах, але затое саля была поўная больш дэмократычнай публікі.

Вечар пачаўся вельмі сымпатычным выступленьнем дзіцячаго хору, зложэнаго с 50 душ, пад кірункам п. М. Дунаева. Дзеці пеялі вельмі бойка і згодна, ды нават дужа добра ўдаўся такі эфэкт, як атказ эха с хораў салі, дзе былі пастаўлены пяцера дзяцей. Песьню: „А у лесі, пры даліне“, на жаданьне публікі, дзеці павінны былі паўтарыць.

Сьпеў соло с прычыны хваробы сьпевачкі адпаў, і першы аддзел дапоўніла дэклямацыя і выступленьне мешанаго хору. Трэба, аднак, зусім шчыра сказаць, што апошні нумэр прайшоў вельмі бледна. Думаем, што тут былі нейкіе прахадзячые прычыны, бо нам ужо не раз даводзілося чуць шмат лепшые выступленьня таго ж хору.

Затое дужа добра прайшоў аднаактовы жарцік Володзьскаго: „Як яны жаніліся“. Хоць сама п'еса вялікшай вартасьці ня мае, аднак дружная, с тэмпэрамэнтам ігра артыстоў і праца рэжысэра зрабілі тое, што публіка нaградзіла спаўніцелёў яе гарачымі оплескамі.

× **Выдача карт на хлеб.** Каб атрымаць карты на хлеб на 28 тыдзень, канечне павінен яўляцца галава сям'і. У чэцьвер, 14 сьнежня, пачаліся прыгатаўленьня дзеля выдачы карт на хлеб. На пытаньня пры гэтым трэба даваць сумленны атказ. Хто не скажэ праўды, таго будуць караць. Хто явіцца ў бюро не ў свой час, той карты не атрымае і астанецца бяз хлеба.

× **Спажыўные справы.** На заседаньні камісіі аб цэнах былі чутны жальбы на недастатачны падвоз малака. Мо' санная дарога паможэ ў гэтай справе.

Падвоз рыбы, бадай, узрасьце, калі пазамерзаюць вазёры і пачнецца лоўля рыбы цераз прорубі.

24 сьнежня, ў нядзелю, рыбны рынак будзе аткрыты.

× **Патрэбны дрэвасекі** у Попілоў. Заяўляцца трэба ў Біржы Працы, Завальная 5.

× **Аб прымусовых работах.** Надрукованые ў тым нумэры апавешчэньня аб праверцы здольнасьці да працы тутэйшых жыхароў і аб прызыве 600 дабравольцоў на работы ня маюць сілы. Замест іх мае вагу ніжэйпісанае апавешчэньне Граданачальніка.

× **Мільённая пазыка.** Каб пакрыць кошты места Вільні, назначэн незвычайны падатак — 1 мільён руб., адлічыўшы сумы, на каторые была зроблена падпіска і каторые выплачэны, як местовая пазыка пад працэнты і з зваротам капіталу. Уся гэта сума будзе разложэна на жыхароў места Вільні, так-званые юрыдычные асобы, саюзы і таварыствы. Граданачальнік у паадзінокіх прыпадках мае права падатак абертаць у местовую пазыку пад працэнты і з заваротам капіталу.

× **Сумма пазычковых квітоў** («нямецкіх рублёў»), якіе знаходзяцца у абароці, 30 лістапада 1916 г. даходзіла да 24.065.150 руб. У тым ліку бумажэк па 25, 10 і 3 руб. — на 20.506.155 руб., а дробных бумажэк па 1 р. і 50 кап. — на 3.558.995 руб.

× **Курс рубля:** офіцыяльны — 1 м. 90 фэн. за рубель; у банках пры прадажы — 2 м. 14 ф., пры куплі—2 м. 18 ф.

Пазычковая каса бярэ 6%.

× **Прапалі:** Міхалка Сьмірноў, 13 гадоў, Шкаплерная вул., і Казюк Шупэнко, 13 гадоў, Стэфанская 41.

Пісьмо у Рэдакцію.

—s—

Камітэт Беларускаго Т-ва п. п. ад в. выказывае гэтым сваю шчырую падзяку ўсім артысткам і артыстам, выступаўшым на вечары 10. XII на карысць беларускіх школ у Вільні, ўсім гаспадаром, гаспадыням і госьцям, быўшым на вечары, друкарні Кухты, безплатна друкаваўшай афішы і праграмы, ўсім фірмам і крамам, каторые, бяз розніцы нацыі і веры, ахвяравалі фанты на лётэрыю на вечары, і, наагул, усім, хто так ці іначэй памог уладзіць вечар дзеля важнай, патрэбнай грамадзкай работы.

Камітэт.

Вільня, 13. XII. 1916.

× **Апавешчэньне аб праверцы здольнасьці да працы.**

У дадатку да майго апавешчэньня 6 лістапада 1916 г. загадана далейшая праверка здольных да працы, асабліва адзначываючы тамака загады аб карах.

Явіцца павінны ўсе тутэйшые жыхары — мужчыны ў межах местоваго округа Вільні ад скончэных 17 да скончэных 60 гадоў, каторые маюць пашпарты Ober Ost, выданые ў Вільні, №№ 45.001 — 120.000:

15 сьнежня 1916 г. ад 8 да 12 гадз. перад абедам і 2 да 6 гадз. паабедзі

1. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 45.001—48.000 у салі пры Людвісарскай вул. 4;

2. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 48.001—51.000 у салі пры Віленскай вул. 10 («Сокол»);

3. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 51.001—54.000 у салі пры Вароньняй вул. 5.

16 сьнежня 1916 г. ад 8 да 12 гадз. перад абедам і ад 2 да 6 гадз. паабедзі

1. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 54.001—57.000 у салі пры Людвісарскай вул. 4;

2. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 57.001—60.000 у салі пры Віленскай вул 10 («Сокол»);

3. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 60.001—63.000 у салі пры Вароньняй вул. 5.

17 сьнежня 1916 г. ад 8 да 12 гадз. перад абедам і ад 2 да 6 гадз. паабедзі

1. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 63.001—66 000 у салі пры Людвісарскай вул. 4;

2. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 66 001—69.000 у салі пры Віленскай вул. 10 («Сокол»);

3. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 69.001—72.000 у салі пры Вароньняй вул. 5.

18 сьнежня 1916 г. ад 8 да 12 гадз. перад абедам і ад 2 да 6 гадз. паабедзі

1. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 72.001—75.000 у салі пры Людвісарскай вул. 4;

2. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 75.001—78.000 у салі пры Віленскай вул. 10 («Сокол»);

3. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 78.001—81.000 у салі пры Вароньняй вул. 5.

19 сьнежня 1916 г. ад 8 да 12 гадз. перад абедам і ад 2 да 6 гадз. паабедзі

1. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 81.001—84.000 у салі пры Людвісарскай вул. 4;

2. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 84.001—87.000 у салі пры Віленскай вул. 10 («Сокол»);

Сьвінапас.

Быў сабе некаліс на сьвеці князевіч; ды было ў яго і князьство, але малюсенькае; ўсёж такі на тым князьстве ён мог пракарміці жонку, дык от і забажаў каралевіч жаніціся.

Яно, папраўдзі, так кажучы, было залішне сьмела, як на князевіча—звертацца да каралеўскай дачкі з гэткай гутаркай: «ці хочэш, паненка, пайсьці за мяне замуж?» Але ён думаў, што яго дзедзізна была слаўна кругом—наўкола, і ўздоўж і ўпоперак, што абы ён пamануў толькі—сотні каралевен усякіх з вялікай радасьцю сказалі-б яму: «згода». Але каралеўна... што яна і як?

Зара, пабачымо.

У князевіча на бацькаўскай магілцы рос сабе рожэвы кусьцік, ды гэткі гожы, гэткі харошы, Божухна Ты мой! У пяць гадоў ён раз толькі красаваў дый то ешчэ адзінюсенькай краскай; але што-ж то была за дзіў-красачка! А пахла яна гэтак водарна, што, бывала, панюхаеш яе, то і забудзеш ўсе свае клапоты і турботы. У гэным кусьціку жыў салавейка, ды гэтак-жэ шчэбетаў мілюсенька, бытцым у ягоным маленькім горлічку ўсе найхарашэйшые мэлёдзіі былі пахаваны. Дык вось гэну краску і гэнаго салавейку князевіч і назначыў на падарунак каралеўні; паклаў ён іх абое у срэбные шкатулкі і паслаў да яе.

Кароль сказаў, каб прынясьці іх у вялікую сьвятліцу, дзе каралеўна з дворкамі забаўлялася ў пожмуркі. Як глянула яна на тые вялікіе шкатулы с падарункамі, то з радасьці аж у далоні заляскала.

— От! Каб ды малюсенькі каток!—сказала. А тут і вынялі рожэвы кусьцік с пышнай краскай.

— Гляньце, як хораша зроблена!—сказалі дворкі.

— Лепей, чым хораша — дадаў кароль: нават пышна зроблена!

Але як даторкнулася да кветкі каралеўна, то с плачам кінулася да бацькі.

— А ей, тата!—кажэ—яна ня штучная, а запраўдная, натуральная!

— Ды годзі вак! Якая на сьлёзы шпаркая! Паглядзім сперша, што ў другой шкатулі!—гукнуў кароль.

От і вынялі салавейку. Ен зацёхкаў гэтак міла, гэтак люба, што ўжо і слова благога ня можна было аб ім сказаці.

— *Superbe! Charman!* выхвалялі дворкі, бо ўсе яны па француску чаўплі — адна за адну горэй.

— Як гэтае пташанё напамінае мне гармоніку нябошчыцы каралевы! — дадаў стары сэнатар: саўсім той самы і голас, і выгра!

— Так!—сказаў кароль, дый заплакаў, як малое дзіця.

— Думаю, што хоць ужо гэтае птушанё не запраўднае?!—кажэ каралеўна.

— Не! Запраўднае, жывюсенькае!—адмовілі пасльі.

— Ну, то ніхай сабе і ляціць здарова! —адцялася каралеўна і ніяк ня згодзілася, каб князевіч прыехаў.

Але гэто князевіча ня вельмі спужало: ўзяў ён, упэцкаўся ў сажу і гліну, насунуў на вочы брыля, дый пастукаўся да караля у браму.

— Дзень добры!—кажэ,—ці можна-б у вас тут пры дварэ якую службу знайсьці?

— Э э-э,—сказаў кароль,—да мяне багата вас просіцца у наймы, ня ведаю, што табе сказаць, падумаю... Ага! Я і забыўся, што мне сьвінапас патрэбен... каб сьвіньней, бачыш, пасьвіць, бо ў маім каралеўстві багата іх!..

(Далей будзе).

3. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 87.001—90.000 у салі пры Вароньняй вул. 5.

20 сьнежня 1916 г. ад 8 да 12 гадз. перад абедам і ад 2 да 6 гадз. паабедзі

1. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 90.001—93.000 у салі пры Людвісарскай вул. 4;

2. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 93.001—96.000 у салі пры Віленскай вул. 10 («Сокол»);

3. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 96.001—99.000 у салі пры Вароньняй вул. 5.

21 сьнежня 1916 г. ад 8 да 12 гадз. перад абедам і ад 2 да 6 гадз. паабедзі

1. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 99.001—102.000 у салі пры Людвісарскай вул. 4;

2. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 102 001—105 000 у салі пры Віленскай вул. 10 («Сокол»);

3. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 105.001—108.000 у салі пры Вароньняй вул. 5.

22 сьнежня 1916 г. ад 8 да 12 гадз. перад абедам і ад 2 да 6 гадз. паабедзі

1. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 108.001—111.000 у салі пры Людвісарскай вул. 4;

2. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 111.001—114.000 у салі пры Віленскай вул. 10 («Сокол»);

3. валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 114 001—да канца у салі пры Вароньняй вул. 5.

Просьб аб звальненьні ад работ пакуль-што падаваць ня трэба.

Асобы, каторые не з'явяцца на праверку, апрыч [кары, будуць у патрэбе ўзяты перш за ўсіх і, адбыўшы кару, будуць залічэны да рабочаго батальёну, або—пры напялічываючых віну варунках — у арэштанцкіе рабочые батальёны.

Апрыч таго загадываецца, як ласка:

Тые мужчыны — тутэйшые жыхары — ў межах местоваго округа Вільні ад скончэных 17 да скончэных 60 гадоў веку, каторым выданы ў Вільні пашпарты Обэр Ост ад № 1 да 45,000 і каторые дагэтуль не явіліся дзеля праверкі іх здольнасьці да працы, — могуць дадаткова явіцца на гэту праверку

23 сьнежня 1916 г. ад 8 г. да 12 г. перад абедам і ад 2 да 6 гадз. паабедзі

валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 1—15.000 у салі пры Людвісарскай вул. 4;

валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 15.001—30.000 у салі пры Віленскай вул. 10 («Сокол»);

валадзельцы пашпартоў Обэр Ост №№ 30 001 да 45.000 у салі пры Вароньняй вул 5.

Асобы, каторые, замест прапушчэнай яўкі, явяцца ў назначэны для іх цяпер дзень, звальняюцца ад кары; калі яны ўжо засуджэны, дык ім будзе памен шэн на палавіну штраф грашмі або кара вастрогам.

Вільна, 11 сьнежня 1916 г.

Der Deutsche Stad hauptmann
Pohl.

✕ **Апавешчэньне.** Жыхары вуліц: Замковай, Каралеўскай, Оранжэрыйнай, Лоточка, Мэтрополітальнай, Воляна, сьв. Анны, Ботанічнай, Шарыкішскай, 1-ай, 2-ой і 3-ай Саламянкі, 1-ай і 2 ой Бэрнардынскай, сьв.-Міхальскай і Літэрацкай прызываюцца неадкладаючы прышчапіць сабе осьпу.

І-шы пункт для прышчэпкі: фальчарская школа пры бальніцы сьв. Якуба — што-дзень ад 10 да 3 гадз., апрыч нядзелі.

II-гі пункт [для прышчэпкі: б. местовы лазарэт, Острабрамская 10, што-дзень ад 12 да 1½ гадз., апрыч панядзелку.

Вільна, 12 сьнежня 1916 г.

Der Deutsche Stadthauptmann
Поль.

Дагляд пладовых дрэў у восені і зімой.

(Гл. пачатак ў № 87).

Бяленьне вапнай, дзякуючы беламу колеру, бароніць кару ў зіме ад лішняго холаду і ад абледзянеласьці ствала; яно затрудняе так сама ўход дрэўным паразітам у шчыліны кары і нішчыць апошніе астаткі наростаў і моху, каторые не ўдалося счысьціць скрабачкай і шчоткай. Вапеннае малако прыгатаўляецца са сьвежагашэнай вапны, і пасьля пэндзлем пабеліваецца ўвесь чэран дрэва. Калі ёсць спрыншоўка, можна карыстацца і ею дзеля бяленьня дрэва.

Пры чышчэньні, само сабой, трэба звертаць так сама увагу на спаршывеўшые пабегі і часьці, хворые на струпы (Fusicladium), на каторых шкодлівые грыбкі устраіваюць сваю зімоўку, вызываючы вясной такіе струпы і лішаі на лістах, а пазьней і на пладах; такіе часьці трэба адрэзываць ад дрэва і зніштажаць. Так сама ня трэба абмінаць зложэных на мелкіх галінках яек, гнёзд гусеніц і інш., кальцавога шаўкапрада, рудака і др., а трэба іх нішчыць. Дзеля нішчэньня гнёзд гусеніц можна ужываць так сама галаўню, каторай выпаліваюцца гусеніцы і іхняя пража.

Важна так сама **управа зямлі,** хацяб толькі ў блізкасьці чэрэна, на сколькі сягае округ дрэва. Округам дрэва завецца той круг зямлі, каторы аценіваецца вярхоўкай дрэва і як далёка падае з яе дождж. Гэты круг зямлі належыць што-году добра перакапаць, а ў вэгетацыйным часе трэба часта разрыхляць зямлю матыкай, ачышчаючы разам і ад зельля. У больших садох добра выраблязь зямлю між дрэў плугам і бараной, абсеіваючы лубінам і гарохам.

А што да гнаеньня, дык найперш трэба здаволіць вялікую патрэбу вапны, асабліва для дрэў с костачковымі пладамі. Вапна дабываецца ў межах занятых зямель. і ёсць яе тут паддастаткам.

Дзеля здаволеньня дрэва азотам можна ужываць гнаёўку. Стаенны гной у цяперашнім часе для упраўных расьлін больш патрэбны, чым для пладовых дрэў. Так сама трэба адрачыся цяпер ад прывозу ў занятые землі штучных гнаёў, як пр. потаж (калі) і фосфарны квас.

(Канец).

З усяго Краю.

На пэдагогічных курсах.

СУВАЛКІ. 4 і 5 сьнежня тут адбыліся эгзамены для вучнёў пэдагогічных курсоў. Эгзаменаваліся 44 асобы, і ўсе здалі эгзамен.

Зладзейская хэўра,

СУВАЛКІ. На апошнім заседеньні акружнаго суда ў Сувалках разбіралася справа аб бандзе зладзеёў, зложэнай с 13 душ. Яны ў тую зіму заніматіся ў Мар'ямпольскім і Вількомірскім паветах массовымі кражамі. Члены банды прыставалі на службу да памешчыкоў і гаспадароў, агледалі двор і будоўлі і разам са сваімі хаўруснікамі абркадалі іх. Уся хэўра засуджэна ў вастрог на доўгі час.

Новы спосаб ашуканства.

ЛЭЭГЕУ, Газенпоцк. ж. д. Адзін селянін прадаў скупшчыку з Лібавы авечку ў мяху. Калі «шчасьлівы» пакупец развязаў дома мех, адтуль выскачыў сабака, пакусаў яго і ўцёк.

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

Палажэньне Трэпова.

ШТОКГОЛЬМ. „Русск. Вед." даносяць, што Трэпов падасцца у адстаўку, калі не даб'ецца выдаленьня Протопопова, бо сам хочэ заняць мейсцо міністра ўнутрэных дзел. Дума гэтак сама прыняла Трэпова ня лішне ласкава: крайніе левые вельмі гудзелі ў часі яго ваяўнічай прамовы.

Развал у правых.

ШТОКГОЛЬМ. Значная часць членоў думскай партіі правых выступіла с партіі с прычыны апошняго скандалу ў Думе Валяй-Маркова. У правых кругах баяцца развалу ўсяе партіі.

«Абаронцы» фінляндзкай конституціі.

ШТОКГОЛЬМ. Газэты даносяць с Фінляндзіі, што там ждуць гэтымі днямі правядзеньня даўно спадзеванаго набору фінляндцоў у расейскае войско.

Англія і Францыя цьвёрда жадаюць гэтаго.

«Санітарные» парадкі.

ШТОКГОЛЬМ. Начальнік санітарнаго упраўленьня палевой арміі апавешчае у сваім прыказе:

Увесь ваенна-мадыцынскі і гаспадарскі склад аднаго ваеннасанітарнаго поезду на румынскім фронці не спаўняе сваіх павінасьцей перад раненымі і вядзе сябе распусна у адносінах да сёстр «Чырвонаго Крыжа» ў поездзі. 4 дактары і 2 скарбнікі будуць па караны за гэта вастрогам.

У другім прыказе гаворыцца, што ў адным расейскім лазарэці на Каўкаскім фронці начыньня да яды выціраюць бруднымі бінтамі ад перэвязкі ран. Раненых і хворых ня мыюць цэлымі месяцамі. Главны доктар Архаров і камэндант лазарэту пасаджэны на месяц у вастрог, а самы лазарэт зачынены на месяц, каб завясьці ў ім санітарны лад.

Прылучэньне румынскіх войск да расейскіх.

ПЕЦЯРБУРГ. У апошнім часі румынскіе ваенные часьці залічэны да расейскаго войска. З гэтаго выходзіць, што главная каманда румынскіх войск перайшла ўжо ў рукі расейцоў.

Значэньне Румыніі для цэнтральных дзержаў.

Якую вагу мае Румынія для таго, хто заўладаў ею ў часі гэтай вайны, відаць з гэткіх цыфр:

У 1913 гаду з Румыніі вывязьлі заграніцу

пшаніцы	—	1841	мільён. кіл.
кукурузы	—	594	„ „
ячменю	—	393	„ „

Расея за той жэ год вывезла пшаніцы і ячменю разам толькі 888 мільёноў кілёгр.

Німа дыму без агня.

ПЕЦЯРБУРГ. (В. Т. Б.). Адміралцейство цьвёрда пярачыць вестках нямецкіх і голендэрскіх газэт, што у апошніх ты днях у Ледавітым акіане затопле ны 16 параходоў са снарадамі. У апошнім часі ні адно судно са снарадамі для Расеі не пагібло.

Вываз цукру.

У 1915—16 г. г з Расеі вывязьлі цукру 4¼ мільёна пудоў — проці 6½ мільёноў у 1914—15 г. г. і 8,666,000 пудоў у 1913—14 г. г. Каля палавіны таго цукру вывязьлі ў Фінляндзію, каля чверці — ў Пэрсію.

З усяго сьвету.

Адстаука аустрыяцкаго габінэту.

ВЕНА. Міністэрство Кэрбэра ў поўным складзе выйшло у адстаўку.

Імператар загадаў утварыць новае міністэрство Шпіц-Мільлеру.

Новы францускі габінэт.

ПАРЫЖ. Новы францускі габінэт складаецца з гэткіх асоб: маршалак і міністэр заграничных спраў Брыан, судоў і народнай асьветы—Вівіяні, фінансоў—Рібо, унутрэных спраў—Мальві, ваенны міністэр—Ліотэй, марскі—Ляказ, народнай гаспадаркі—Клеманcо.

Гэнерал Нівэль назначэн главнакамандуючым на нямецкім фронці.

ТЕЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньня:

12 XII. Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскаго: На полі бітвы над Соммай баевая работа артылерыі ізноў узмацавалася.

Фронт нямецкаго Насьледкіка: На ўсходнім березі Маасу і каля Мозэля—сільны артылерыйскі і мінны агонь без пешых выступленьнёў.

Усходні тэатр:

Фронт Леопольда Баварскаго: Удачные патрульные опэрацыі на Стоходзі далі нам паланных, ад каторых мы даведаліся цэнные ведамасьці аб разстаноўцы расейскіх сіл.

Фронт эрц-гэрцога Іозэфа: Атакі ў лясістых Карпатах, на Смотрэцу і пры Бабе Людовай, а так сама паўтораные ў начы атакі пры Мэстэканэсті зусім адбіты нямецкім і аўстрыяцкім войскам. Наабапол даліны Тротусуля расейцы ў дарэмных штурмах 'марнавалі людзэй і снарады. Нямецкіе егры на поўначы ад Люновай вярнуліся з адной опэрацііі, вядучы 10 палонных і 2 кулемёты. На поўначы ад Сульта расейцы выкінуты з занятай імі нідаўна вяршыны.

Фронт фэльдмаршалка Макензэна: На ўсім фронці — баевые удачы. Урпіцэні і Мізіль—у нашых руках. Армейская група Макензэна за апошніе тры дні дабыла у румыноў 10.000 палонных, некольві гармат і шмат палевых матэр'ялоў.

Македонскі фронт: Войскі саюзьнікоў, асабліва сэрбы, кожын дзень заядла атакуюць нямецка-боўгарскіе пазыціі на абодвых берагох Чэрнай. Учора яны ізноў цяжка і крывава разбіты.

13.XII. Заходні тэатр:

Апрыч крапчэўшаго 'момэнтамі агня артылерыі на Сомме і Маасе, ды начных патрульных біть у ўсіх арміі,—вялікшых біть не было.

Усходні тэатр:

Фронт Леопольда Баварскаго: Нічога выдатнаго.

Фронт эрц-гэрцога Іозэфа: На ўсходнім фронці ў Семіградзіі нямецкіе і аўстрыяцкіе войскі і ўчора адбілі атакі расейцоў у гарах Джыэрджыу і наабапол даліны Тротусуля. Мы ўзялі палонных.

Фронт фэльдмаршалка Макензэна: Узмацаваные расейскай конніцай ворагі ешчэ раз аказалі адпор за вельмі падняўшайся Яломітай. Яны ізноў прымушэны адступіць на паўночны ўсход. Дунайская і 9-я арміі ідуць за імі на ўсеньвім фронці. На дарозі да Буцеў мы шмат пасунуліся ўпярод і ізноў узялі ўчора больш за 4.000 палонных.

Македонскі фронт: Пасьля разгрому у апошніе дні ворагі устрымліваліся ад атак.

Аустрыяцкіе апавешчэньня.

ВЕНА, 11.XII. **Усходні тэатр:** (гл. нямецкае апавешч.).

Італьянскі тэатр: Без перамен.

ВЕНА 12.XII. **Усходні тэатр:** (гл. нямецкае апав.).

Італьянскі тэатр: Нічога новаго.

ВЕНА 13.XII. **Усходні тэатр:** (гл. нямецк. апав.).

Італьянскі тэатр: Без парамен

Падводная вайна.

БЭРЛІН. Адна з нямецкіх падводных лодак была ў падарожы 55 дзён, не заходзячы ні ў які порт і не аднаўляючы сваіх запасоў. Гэткая доўгая падарожа лічылася ешчэ нідаўна для падводнай лодкі немагчымай.

Крывавае жніво.

ЛОНДОН. Паводлуг статыстыкі, ад пачатку вайны пагіблі дагэтуль 12.694 члены англіцкіх высока-арыстократычных сямей.

Проці вайны.

ПАРЫЖ. Парлямэнт. Социаліст Брыссон пратэставаў проці прадоўжэньня пякельнай вайны. Ен кліккнуў: „Даволі вайны, каторая можэ трываць ешчэ 20 або 30 гадоў!"

ПАРЫЖ. Парлямэнт. Дэпутат Рукастадо сказаў: „Войні ўжо даволі! Цяжкіе небяспечнасьці грозяць бацькаўшчыне. Ганьба далей нішчыць сваю расу! Францыя дала ўсё, а ці-ж Англія ўсё дала?"

Разруха у Грэціі.

БЭРН. Грэцкае правіцельство падало пратэст проці блокады берагоў Грэціі.

ЦУРЫХ. Паводлуг вестак з Грэціі, грэцкі урад загадаў мобілізацію ўсіх сухапутных сіл.

Арэштованы 1600 староннікоў Вэнізэлоса. Бургомістра Афін і ешчэ 180 асоб вінавацяць у здрадзе гасударства.

БЭРЛІН. «Voss. Ztg.» даносіць з лондонскай крыніцы, што новы англіцкі урад пераконан, аб ваенным выступленьні Грэціі на старане цэнтральных дзержаў.

ФРАНКФУРТ. З Афін даносяць:

Глаўнакамандуючый саюзьніцкім флотам у грэцкіх водах, адмірал Фурнэ, с прычыны апошніх прыпадкоў узят адгэтуль. На яго мейсцо назначэн віцэ-адмірал Гошэ.

АФІНЫ У сваім прыказе для арміі кароль дзякуе войску за вернасць і адпор ворагам дынастіі і высказывае надзею, што навальніца мінецца, ды што Грэція ідзе насустрэчу больш шчасьлівай будучыне.

ЛОНДОН. Рэўтэр даведаўся, што Грэціі будзе послана новая нота з дамаганьнямі. Саюзьнікі зажадаюць поўнаго разброеньня Грэціі, аддачы ў іх рукі поўнаго кантролю над почтай, тэлеграфам і чыгункамі і выпуска на волю староннікоў Вэнізэлоса.

Спіс ваенна-палонных з нашаго краю.

З Вільні і Віленскай губэрні.

Табор для ваенна-палонных Lechfeld.

Філіповіч Іван, Вільня.
Гічэўскі Язэп, "
Готоўт Болеслаў, "
Граўжэл Казімір, "
Гулецкі Сямён, "
Гемжэўскі Сыльвэстар, "
Гатоўскі Сыльвэстар, "
Яновіч Аўгустын, "
Кастромэцкі Вінцэнты, "
Кэрманн Язэп, "
Круглінскі Адольф, "
Конскі Язэп, "
Кукянец Болеслаў, "
Курылоў Антон, "
Кібарт Ігнат, "
Кізэк Павал, "
Кісель Лаўрэнцій, "
Крэвацкі Міхаіл, "
Каспэровіч Антон, "
Леон Юльян, "
Ловкіс Кароль, "
Маркоўскі Піліп, "
Макарэвіч Базыль, "
Малдіс Уладыслаў, "
Медус Болеслаў, "
Новалінскі Вінцэнты, "
Окулевіч Тадэуш, "
Петрыкевіч Язэп, "
Петкевіч Язэп, "
Рыхлевіч Ігнат, "
Роўда Андрэй, "
Садоўскі Іван, "
Шевяго Констанцін, "
Швэйкоўскі Іван, "
Сочыўка Базыль, "
Сюрэвіч Мацей, "
Скетрч (?) Вінцэнты, "
Шляхціч Іларыон, "
Сарока Констанцін, "
Томчэнок Ігнат, "
Шустоў Валер'ян, "
Томашэвіч Міхаіл "
Троцкі Юльян, "
Вінскутонец Фэлікс, "
Валодзька Майсей, "
Велічэнко Язэп, "

Табор для ваенна-палонных Dülmen.

Салодкіч Сьцепан, Русакі.

Табор для ваенна-палонных Heuberg.

Бальбацін Вінцэнты, Мішуковічы.
Андрушкевіч Казімір, Огімані.
Біркевіч Дом. Зічкі.
Блажук Міхаіл, Чэхоўцы.
Буяноўскі Франц, Элізаглова.
Дукча Казімір, Вільня.
Федоровіч Франц, Кемелішкі.
Гадэйтіе Язэп, Помена.
Грыгоровіч Зыгмунт, Вільня.
Грынюк Станіслаў, Соркуці.
Грышкевіч Язэп, Вільня.
Грудоў Людвік, Скаіст.
Янушкевіч Пётр, Вільня.
Юроловіч Мацей, Бэлінга.
Кавэцкі Броніслаў, Відэйск.
Квяткоўскі Эдмунд, Бело.
Кальчуго Аўгуст, Дубстаны.
Камінскі Іван, Сукнеў.
Кіслоўскі Казімір, Вільня.
Колеснік Ігнат, Грубіканцы.
Клюбовіч Іван, Гірдніні.
Кунцэвіч Андрэй Сьлевараз.
Купцэвіч Язэп, Ліпкі.
Лічоўскі Нікадэм, Ласьнікі.
Малькевіч Броніслаў, Турково.
Марцінкевіч Тэофіль, Падольле.
Мацкель Александар, Вікшняны.
Маркевіч Міхаіл, Александрын.
Матэцкі Язэп, Дворчаны.
Мекін Юльян, Субоч.
Міколаюн Ігнат, Блікшыкі.
Міскіс Язэп, Эданцвово.
Настушэвіч Антон, Аднопольле.
Наўсевіч Міхаіл, Дворышчэ.
Окстоліс Язэп, Вільня.
Орлоўскі Владзімір, Дрванель.
Оршэўскі Антон, Барскун.
Осьвецуньскі Антон, Вільня.
Петровіч Броніслаў, Гірново.
Петроканец Ігнат, Сьлесарч.
Петровіч Гэврых (?), Шотполь.
Познаньскі Язэп, Трокі.
Радзінскі Язэп, Порудон.
Рынкевіч Пётр, Вільня.
Савіч Антон, Новсполкі (?).
Сэткоўскі Язэп, Гародно.

(Канец будзе).

Падпіска на „Гоман" з дастаукай да хаты у Вільні не прынімаецца.

Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтво «Гоман». Редактар В. Ластоўскі.